Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

6 САКАВІКА 2007 г. АЎТОРАК

№ 44 (25909)

Кошт 350 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

## Рабочы дзень пераносіцца з пятніцы 9 сакавіка на суботу 17 сакавіка

**Адпаведнае рашэнне змяшчаецца ў пастанове Савета Міністраў ад 3 сакавіка гэтага года № 285.**

Згодна з пастановай урада, арганізацыям прадастаўлена права з улікам спецыфікі вытворчасці ажыццяўляць перанос рабочага дня ў іншым парадку ў адпаведнасці з заканадаўствам.

**БЕЛТА.**

## Графік выплаты пенсій не зменіцца

**Перанос рабочага дня з пятніцы 9 сакавіка на суботу 17 сакавіка не прывядзе да змянення графіка выплаты пенсій.**

Як паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў РУП «Белпошта», аддзяленні сувязі ў рэспубліцы будуць працаваць 9 сакавіка, таму выплата пенсій будзе ажыццяўляцца ў звычайным рэжыме.

Што да тых пенсіянераў, у якіх па графіку днём выплаты пенсіі з'яўляецца 8 чысло месяца, то яны змогуць атрымаць яе напярэдадні Дня жанчын — 7 сакавіка. Карэкціроўка графіка выплаты пенсій у сувязі са святочным днём — звычайная практыка, падкрэслілі ў РУП «Белпошта». Гэта дае магчымасць забяспечыць пенсійныя выплаты за тыя дні, калі не працуюць паштовыя аддзяленні. Фінансаванне пенсій праводзіцца своечасова і ў неабходным аб'ёме.

**Алена ПРУС, БЕЛТА.**

## У Еўрасаюзе фарміруецца новы погляд на Беларусь

**Сённяшнія адносіны Беларусі з Еўропай з'яўляюцца візначальнымі для будучыні. Такі пункт гледжання выказаў дэпутат Федэральнага парламента Бельгіі, старшыня бельгійскай секцыі ў рамках МПС па супрацоўніцтву з Беларуссю Жан-Поль Анры на сустрэчы ў Мінску са спікерам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімірам Канаплёвым.**

Нагадаем, што бельгійская парламенцкая дэлегацыя знаходзіцца цяпер з візітам у нашай краіне. Жан-Поль Анры, які ўзначальвае дэлегацыю, з'яўляецца членам ПАСЕ і асацыіраваным членам ПА АБСЕ.

«Я заўсёды быў прыхільнікам развіцця парламенцкай дыпламатыі і заўсёды шкадаваў аб той карыкатурнай карціцы Беларусі, якую часта можна ўбачыць у Еўропе. Я імкнуся садзейнічаць таму, каб еўрапейцы лепш даведаліся пра Беларусь», — сказаў замежны госць.

Ён паведаміў, што ў бліжэйшыя дні Рэспубліку Беларусь «плануе наведаць дэлегацыя ад Хаўера Саланы» (вярхоўнага прадстаўніка Еўрасаюза па знешняй палітыцы і бяспецы). Гэта сведчыць аб тым, лічыць Жан-Поль Анры, што ў Еўропе пачынае фарміравацца іншы, новы погляд на беларускую дзяржаву. На думку бельгійскага дэпутата, «абодва бакі павінны выкарыстаць гэты шанц». Бельгійскі парламентарый таксама дадаў, што быў бы рады ўбачыць Уладзіміра Канаплёва з візітам у Брусэлі. Жань-Поль Анры перакананы, што адносіны паміж бельгійскім і беларускім парламентамі прадаўжаюць развівацца.

Уладзімір Канаплёў падзякаваў замежнаму госцю за тую падтрымку, якую бельгійскія парламентарыі заўсёды аказваюць беларускім калегам у ПАСЕ. Ён выказаў надзею, што супрацоўніцтва паміж парламентарыямі Беларусі і Савета Еўропы будзе больш цесным і плённым.

«Улічваючы, што Брусель — гэта цэнтр для важнейшых міжнародных арганізацый, сустрэчы з бельгійскімі парламентарыямі заўсёды вельмі важныя для беларускага боку», — падкрэсліў спікер.

**БЕЛТА.**

## Сёлета сакавік чакаецца цяплейшы, чым звычайна

**Сёлета сакавік будзе цяплейшы, чым звычайна, паведаміла галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Вольга Фядотава. Паводле яе слоў, сярэдняя тэмпература месяца чакаецца на 1,5 градуса вышэй за кліматычную норму — ад 3 градусаў марозу на паўночным усходзе да 1 градуса цяпла на паўднёвым захадзе рэспублікі. Сярэднямесячная колькасць ападкаў прагназуецца ў межах шматгадовых значэнняў. Норма ападкаў у сакавіку складае 29—44 мм.**

Першыя веснавыя дні, нягледзячы на воблачнасць, былі на 4—7 градусаў цяплейшыя, чым звычайна, а максімальная тэмпература паветра днём дасягала ад нуля да плюс 5 градусаў, на паўднёвым захадзе краіны складала плюс 6—10 градусаў. У сувязі з такім цёплым надвор'ем у Брэсцкай вобласці снег ужо сышоў, а на астатняй частцы тэрыторыі рэспублікі вышыня снежнага покрыва складае ад 5 да 30 см. Аднак, як сцвярджае спецыяліст, ападкі ў выглядзе снегу ў сакавіку яшчэ будуць.

На гэтым тыдні Беларусь апынецца пад уплывам цёплых паветраных мас, што паступаюць з поўдня Еўропы, паведаміла галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Вольга Фядотава. У ноч на 6 сакавіка тэрыторыя рэспублікі будзе знаходзіцца ў вобласці павышанага ціску, таму істотных ападкаў не чакаецца і падмарозіць да мінус 1—7 градусаў. Аднак ужо заўтра раніцай на захадзе Брэсцкай і Гродзенскай абласцей пройдуць невялікія ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу.

Удзень, 6 сакавіка, атлантычны фронт, які перамяшчаецца з Заходняй Еўропы, прынясе ў Беларусь мокры снег і дождж. Месцамі чакаецца туман, у ранішні час слабы галалёд, на асобных участках дарог галалёдзіца. Удзень будзе ад 1 да 7 градусаў цяпла.

7 сакавіка месцамі чакаюцца ападкі ў выглядзе дажджу. Не абыдзецца без туману. У начны час тэмпература паветра будзе ад мінус 3 да плюс 3 градусаў. Удзень паветра прагрэецца да плюс 2—8 градусаў. У Брэсцкай і Гродзенскай абласцях — да 11 градусаў цяпла.

8 сакавіка характар надвор'я істотна не зменіцца. У многіх раёнах пройдзе дождж, згусціцца туман. У начны час тэмпература паветра будзе ад 1 градуса марозу да 5 градусаў цяпла. Удзень чакаецца 3—9 градусаў вышэй за нуль. На поўдні краіны паветра прагрэецца да плюс 13 градусаў.

Паводле папярэдніх даных, у канцы тыдня Беларусь застанецца пад уплывам цёплых, але вільготных паветраных мас, што паступаюць з Заходняй Еўропы. Таму чакаюцца ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. У начны час тэмпература паветра складзе ад 2 градусаў марозу да 5 градусаў цяпла. Удзень — ад 4 да 10 градусаў цяпла. Такім чынам, у Беларусі ўстановіцца па-веснавому цёплае, але яшчэ даволі вільготнае надвор'е, падкрэсліла спецыяліст.

**БЕЛТА.**

# Беларусь зацікаўлена ў супрацоўніцтве з ААЭ ў гандлёва-эканамічнай і інвестыцыйнай сферах



Фота БЕЛТА.

Беларусь зацікаўлена ў развіцці ўсебаковага супрацоўніцтва з Аб'яднанымі Арабскімі Эміратамі, перш за ўсё ў гандлёва-эканамічнай і інвестыцыйнай сферах. Гэты факт асабліва адзначыў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка 5 сакавіка на сустрэчы з прэзідэнтам, правіцелем эмірата Абу-Дабі шэйхам Халіфой бен Заідам Аль Нахаянам. Афіцыйны візіт беларускага лідара ў гэту краіну праходзіць з 4 па 6 сакавіка.

Як падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, у Беларусі ёсць канкрэтныя інвестыцыйныя прапановы, якія рэспубліка гатова прадставіць ААЭ для разгляду. «Мы гатовы зрабіць усё, каб эміраты маглі актыўна прысутнічаць у Еўропе», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

У сваю чаргу шэйх Халіфа бен Заід Аль Нахаян пацвердзіў гатоўнасць ААЭ да супрацоўніцтва з Беларуссю. На яго думку, геаграфічная аддаленасць дзвюх краін не з'яўляецца перашкодай для развіцця плённага ўзаемадзеяння.

Лідары Беларусі і ААЭ абмеркавалі магчымасці пашырэння двухбаковага супрацоўніцтва ў гандлёва-эканамічнай і іншых сферах, якія маюць узаемны інтарэс.

У сталіцы Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў прайшла таксама сустрэча Аляксандра Лукашэнкі з наследным прынцам эмірата Абу-Дабі, намеснікам Вярхоўнага галоўнакамандуючага Узброенымі Сіламі ААЭ шэйхам Мухамедам бен Заідам Аль Нахаянам.

Бакі адзначылі неабходнасць больш поўна выкарыстоўваць патэнцыял, які ёсць у дзвюх краін.

У гэты ж дзень Аляксандр Лукашэнка наведаў горад Дубай, дзе адбылася яго сустрэча з віцэ-прэзідэнтам, прэм'ер-міністрам, міністрам абароны ААЭ, правіцелем эмірата Дубай шэйхам Мухамедам бен Рашыдам Аль Мактумам. У час перагавораў абмеркаваны перспектывы развіцця ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва.

Паралельна з перагаворамі вышэйшага кіраўніцтва дзвюх краін праходзілі сустрэчы членаў беларускай дэлегацыі з эмірацкімі калегамі і партнёрамі.

У прыватнасці, кіраўнік МЗС Беларусі Сяргей Мартынаў сустрэўся з дзяржаўным міністрам па замежных справах ААЭ Мухамедам Хусейнам Аль Шаалі.

Кіраўнік беларускага знешнепалітычнага ведамства падкрэсліў значэнне, якое Эміраты адыгрываюць у гэтым рэгіёне. Ён пазітыўна ацаніў той факт, што Беларусь і ААЭ цесна супрацоўнічаюць у ААН і Руху недалучэння. Важным з'яўляецца і тое, што паміж дзвюма краінамі ёсць кантакты на вышэйшым узроўні.

Па выніках перагавораў дэлегацый Беларусі і ААЭ адбылося падпісанне 5 двухбаковых дакументаў. У прыватнасці, заключаны пагадненні аб паветраных зносінах, аб ваенна-тэхнічным супрацоўніцтве, аб супрацоўніцтве паміж Беларускім дзяржаўным універсітэтам і Універсітэтам ААЭ.

Старшыня Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Міхаіл Паўлаў заключыў з кіраўніком Дэпартамента муніцыпалітэтаў і сельскай гаспадаркі Аду-Дабі пагадненне аб устанаўленні пабрацімскіх сувязяў паміж сталіцамі дзвюх дзяржаў.

Таксама падпісаны мемарандум паміж міністэрствамі ўнутраных спраў Беларусі і ААЭ аб узаемаразуменні і супрацоўніцтве ў сферы бяспекі.

Развіццё супрацоўніцтва з ААЭ з'яўляецца адным з важных напрамкаў знешняй палітыкі Беларусі ў рэгіёне Блізкага Усходу. Аб'яднаныя Арабскія Эміраты — асноўны гандлёвы партнёр нашай рэспублікі сярод арабскіх дзяржаў Персідскага заліва.

У 2006 годзе аб'ём беларуска-эмірацкага тавараабароту склаў $26,1 млн. Экспарт з Беларусі — $24,3 млн. Ён уключае прадукцыю машынабудавання, нафтапрадукты, падшыпнікі, шыны, шкловалакно.

6 сакавіка прадоўжыцца візіт Прэзідэнта Беларусі ў Аб'яднаныя Арабскія Эміраты. Гэта другі візіт Аляксандра Лукашэнкі ў ААЭ, першы адбыўся ў сакавіку 2000 года.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## У Беларусі ў Год дзіцяці пройдзе больш як 50 шырокамаштабных рэспубліканскіх мерапрыемстваў і акцый

Рэспубліканскі план мерапрыемстваў па правядзенню ў 2007 годзе Года дзіцяці зацверджаны пастановай Савета Міністраў № 236 ад 24 лютага 2007 года.

Старшынёй арганізацыйнага камітэта назначаны намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Аляксандр Косінец, а намеснікам старшыні — міністр адукацыі Аляксандр Радзькоў.

**БЕЛТА.**

# БУЛЬБА НА ЛЮБЫ ГУСТ

**З 1 САКАВІКА РУП «ІНСТЫТУТ БУЛЬБАВОДСТВА НАН БЕЛАРУСІ», ШТО Ў САМАХВАЛАВІЧАХ, ПАЧАЎ РЭАЛІЗАЦЫЮ НАСЕННАЙ БУЛЬБЫ ЯК СЕЛЬГАСПРАДПРЫЕМСТВАМ, ТАК І ПРЫВАТНАМУ СЕКТАРУ**

— На сёння мы прапануем 17 гатункаў бульбы розных тэрмінаў выспявання і гаспадарчага прызначэння, — гаворыць намеснік генеральнага дырэктара па навуцы і інвестыцыях РУП Навукова-практычнага цэнтра НАН па бульбаводству і плодаагародніцтву Іван БУСЬКО.

— Мы не першы год супрацоўнічаем з райспажыўсаюзамі ўсіх без выключэння абласцей Беларусі па правядзенню сортаабмену і сортаабнаўленню насеннага матэрыялу, у тым ліку і для прыватнага сектара, — гаворыць Іван Іванавіч. — Райспажыўсаюзы папярэдне робяць заяўку, колькі бульбы і якога гатунку маюць жаданне купіць жыхары, і гэтую заяўку падаюць нам, а мы стараемся задаволіць просьбу і адпускаем паводле папярэдняй аплаты. Задавальняюцца таксама патрэбы кожнага, хто мае магчымасць прыехаць да нас у інстытут.

**— Якія гатункі карыстаюцца попытам сярод прыватнікаў?**

— Як правіла, раннія, такія, як «Аксаміт», «Дэльфін», «Лазурыт», сярэднераннія «Адысей», «Нептун», «Брыз», «Дзіна», сярэдняспелыя «Скарб», «Крыніца», «Талісман», «Дар» і інш. Хоць лічыцца, што бульба сярэдняпозніх і позніх гатункаў больш смачная, яна вызначаецца павышаным утрыманнем крухмалу. Гэта «Сузор'е», «Ветразь», «Здабытак», «Блакіт». Сярэдняпознія «Верас» і «Ветразь» — універсальныя гатункі, першы прыгодны ў тым ліку для вырошчвання на цяжкіх глебах, другі мае інтэнсіўнае накапленне ўраджаю і высокую таварнасць клубняў. Накапленне крухмалу ў сярэднераннягя гатунку «Архідэя» з'яўляецца даволі высокім для гэтага тэрміну выспявання. А ўвогуле, мы заўсёды забяспечваем гатункі, якія рэалізуем, характарыстыкай.

**— Якімі навінкамі вы парадуеце пакупнікоў сёлета?**

— Паступіў у продаж ранні гатунак «Лілея», якога дагэтуль не было. У яго прыгожая форма клубня, на 35—38-ы дзень пасля ўсходаў ужо можна атрымаць бульбу таварнага выгляду. Па заходніх мерках гатунак лічыцца ўльтраранні. Хачу сказаць, што пасадачнага матэрыялу гэтага гатунку не так і многа, і купіць яго той, хто паспяшаецца.

**— Што з гатункаў замежнай вытворчасці будзе прадавацца ў інстытуце?**

— Прадаюцца раннія гатункі нямецкай селекцыі «Альвара», «Дэбора», «Рыкея», «Карола». Гэтыя гатункі хоць і замежнай вытворчасці, але яны ёсць у нашым рэестры, і мы маем права іх вырошчваць і рэалізоўваць.

**— У якую тару фасуецца сёння бульба?**

— Мы крышку адступілі ад продажу насеннай бульбы ў цэлафанавых пакетах, гэта было зручна, бо ніводзін клубень не мог згубіцца пры такой расфасоўцы. Але ў такія пакеты, асабліва калі яны завязаныя, не паступае паветра, бульба пацее і пры рэалізацыі мае непрывабны выгляд. Сёлета мы насенную бульбу фасуем у поліэтыленавую сетку па 5, 7 і 30 кілаграмаў.

**— Па якой цане рэалізоўваецца бульба?**

— Ранняя група гатункаў — па 1280, сярэднеранняя — па 1070, а познаспелыя гатункі па 1060 рублёў за кілаграм.

**— Іван Іванавіч, ці не будзе так, што пад выглядам суперэлітнай бульбы з інстытута будзе прадавацца іншая?**

— Часта даводзіцца чуць, што купіў вясной элітную бульбу, але ўраджай атрымаў дрэнны. На пытанне, дзе куплялі, чуеш у адказ: «На рынку ці ў час масавага распродажу, сказалі, што гэта бульба з Самахвалавіч». Сказаць можна што заўгодна. Але калі вы купілі бульбу на тэрыторыі інстытута, мы гатовыя выслухаць прэтэнзіі і разабрацца, у чым прычына дрэннага ўраджаю. Купляюць у нас і прыватнікі для далейшага перапродажу. Для тых, хто ў нас купляе бульбу, даём атэстат на насенне і выпісваем накладную за подпісам генеральнага дырэктара ці яго намеснікаў, з пячаткай і штампам нашай установы. Калі такія дакументы рэалізатары прадставіць не могуць, тады і атрымліваецца знаёмая ўжо нам сітуацыя.

**— Ці ёсць у Мінску ваш фірменны магазін?**

— Не, продаж праводзіцца толькі на тэрыторыі інстытута ў Самахвалавічах.

**Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ.**

ISSN 1990-763X

**КУРСЫ ВАЛЮТ**

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 06.03.2007 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 142,00 |
| 1 еўра | 2 812,55 |
| 1 латвійскі лат | 3983,26 |
| 1 літоўскі літ | 814,57 |
| 1 чэшская крона | 99,90 |
| 1 польскі злоты | 718,67 |
| 1 расійскі рубель | 81,71 |
| 1 украінская грыўня | 424,77 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 26,2147 |
| 10 UAH | 51,7883 |
| 1000 BYR | 12,2021 |
| EUR | 34,4618 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 5.03.2007 г.)*

| | |
|---|---|
| USD | 2210 / 2320 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпісвайцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2007 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

Уражанне

# КОЛЕР МАЁЙ БЕЛАРУСІ

**У Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі працуе выстава твораў Леаніда Шчамялёва**



Фота БЕЛТА.

**Творчасць народнага мастака Беларусі Леаніда Шчамялёва для сталага гледача не загадка, а заўсёднае адкрыццё. Але і для дасведчаных гэта заўсёды здзіўленне. Здзіўленне не адно ад працавітай руплівасці мастака, але і ад ягонай нязменнай прыхільнасці сваёй тэме, почырку і свайму колеру. Так, менавіта колеру. Бо шмат у каго менавіта колер выклікае разуменне, што творы гэтыя належаць Леаніду Шчамялёву.**

Для мяне гэта таксама своеасаблівы апазнавальны знак маёй Беларусі і творчай адметнасці мастака.

Напэўна, кожны з нас чуў словы вядомай песні «Каб любіць Беларусь нашу мілую, трэба ў розных краях пабываць...». Прызнаюся, я па-рознаму ў розны час ставіўся да гэтых слоў. І ў якасці аргумента прыводзіў прыклад маіх бацькоў, якія, як і шмат хто з даўнейшых жыхароў, не мелі магчымасці быць далёка за яе межамі. Але ці шкодзіла гэта ім любіць нашу зямлю, шанаваць наша нацыянальнае і жыць з імі — заўсёды, пастаянна, нязводна?

Аднак быў момант, калі лёс закінуў мяне хоць і не надта далёка, але ж за межы Беларусі. І мо толькі тады я больш глыбока зразумеў сэнс гэтых слоў. Сапраўды, каб больш і мацней любіць Беларусь нашу мілую, часам трэба зірнуць на яе як бы збоку, здаля, вачыма часова адарванага ад яе. І тады нешта чуллівае кране тваю душу, нешта ў ёй зварухнецца, і ты адчуеш самае звыклае і простае: няма на гэтым вялізным зямным шары нічога мілейшага за сваё, роднае, блізкае, што завецца гэтак проста і зваблівa — мая Радзіма, мая Беларусь.

*(Заканчэнне на 3-й стар.)*

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## КІТАЙ ІСТОТНА ПАВЯЛІЧЫЎ ВЫДАТКІ НА АБАРОНУ

**Кітайскія ўлады аб'явілі аб рэкордным павелічэнні ваеннага бюджэту краіны. Сёлета яго рост складзе 17,8 працэнта. У грашовым выглядзе выдаткі Кітая на абарону складуць 45,3 млрд долараў.**

Між тым заходнія эксперты мяркуюць, што рэальныя абаронныя выдаткі Кітая ў два-тры разы перавышаюць заяўленыя: многія праграмы праходзяць па сакрэтных артыкулах бюджэту. Аналітыкі выказваюць заклапочанасць, што рост ваенных расходаў актывізуе гонку ўзбраенняў у Азіі.

Кітайская армія налічвае 2,3 мільёна чалавек і з'яўляецца буйнейшай у свеце па колькасці. Аднак толькі ў апошнія гады ўрад стаў прымаць захады па яе пераўзбраенню. Мяркуецца, што павелічэнне ваеннага бюджэту звязана з ростам выдаткаў на ракетныя сістэмы, сродкі электроннай барацьбы і іншае высокатэхнічнае абсталяванне. Начальнік упраўлення тылавога забеспячэння Народна-вызваленчай арміі Кітая Ляо Сілун падкрэсліў, што павелічэнне абароннага бюджэту выклікана нестабільнай сітуацыяй у сучасным свеце. Для параўнання, Пентагон сёлета просіць на свае патрэбы 481 млрд долараў.

## ГЕНШТАБ РФ: ДАЛЬНЯЯ АВІЯЦЫЯ ЗДОЛЬНАЯ ЗНІШЧЫЦЬ ЭЛЕМЕНТЫ ПРА Ў ЕЎРОПЕ

Камандуючы 37-й паветранай арміяй генерал-лейтэнант Ігар Хвораў заявіў, што элементы ПРА з'яўляюцца слабаабароненымі, і расійскім баявым самалётам будзе нескладана іх знішчыць. Пры гэтым ён не адмаўляў, што размяшчэнне ПРА ва Усходняй Еўропе павысіць разведмагчымасці ЗША.

## НА ВЫБАРАХ У ЭСТОНІІ ПЕРАМАГЛА ПАРТЫЯ ПРЭМ'ЕРА

**На парламенцкіх выбарах, якія прайшлі ў нядзелю, перамогу атрымала Рэфармісцкая партыя на чале з прэм'ер-міністрам Эстоніі Андрусам Ансіпам, якая атрымала 31 мандат са 101 у парламенце. Другой фінішавала Цэнтрысцкая партыя, якая з'яўляецца партнёрам рэфармістаў па кіруючай кааліцыі.**

Як вядома, лідар рэфармістаў і цяперашні кіраўнік урада Ансіп з'яўляецца паслядоўнікам прыхільнікаў дэмантажу помніка Воіну-вызваліцелю ў цэнтры Таліна. Ён неаднаразова заяўляў, што «гэты помнік з'яўляецца сімвалам акупацыі Эстоніі Савецкім Саюзам і яму не месца ў цэнтры эстонскай сталіцы».

## ЖАНЧЫНА ДАВЕДАЛАСЯ ПРА ЦЯЖАРНАСЦЬ ЗА ДВА ДНІ ДА РОДАЎ

**Жыхарка ЗША, вага якой складае 180 кілаграмаў, даведалася пра сваю цяжарнасць толькі за два дні да родаў.**

39-гадовая Эйпрыл Брэнам паступіла ў аддзяленне хуткай дапамогі са скаргамі на боль у вобласці страўніка. Агледзеўшы жанчыну, урачы прыйшлі да высновы, што яна знаходзіцца на апошнім месяцы цяжарнасці. Праз два дні шляхам кесарава сячэння Брэнам нарадзіла здаровага хлопчыка вагой 3 кілаграмы 400 грамаў. Дзіцё назвалі Вальтэр Скот Эдвардс III.

# РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

## ПАЧАЛОСЯ ВЫВУЧЭННЕ ДРУГОЙ ПЛЯЦОЎКІ ПАД БУДАЎНІЦТВА АТАМНАЙ СТАНЦЫІ

**Аб гэтым паведаміў журналістам старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Міхаіл Мясніковіч.**

Паводле яго інфармацыі, спецыялісты пачалі даследаванне другой пляцоўкі — Кукшынаўскай у Шклоўска-Горацкім пункце Магілёўскай вобласці. Нагадаем, што даследаванне Краснапалянскай пляцоўкі (таксама ў Магілёўскай вобласці) ідзе ўжо некалькі месяцаў.

Міхаіл Мясніковіч дадаў таксама, што тэрмін правядзення папярэдніх пошукаў складае каля паўгода.

Як паведамляла БЕЛТА, у 2007 годзе Беларусь павінна завяршыць тэарэтычныя пошукі і выбраць стратэгічнага партнёра для рэалізацыі праекта, пачаць перагаворы з пастаўшчыком тэхналогій і абсталявання. Практычную рэалізацыю праекта будаўніцтва АЭС у Беларусі маюць намер пачаць у 2008 годзе. Першы блок станцыі магутнасцю 1 тыс. мегават плануецца ўвесці ў 2013—2014 гадах.

**БЕЛТА.**

## КОЛЬКАСЦЬ ДЭКЛАРАЦЫЙ ПАВЯЛІЧЫЛАСЯ Ў 1,5 РАЗА

**У гэтым годзе ў параўнанні з леташнім (па стану на 1 сакавіка 2006 года) колькасць прадстаўленых дэкларацый у падатковыя органы краіны павялічылася на 77 106, або ў 1,5 раза.**

Паводле інфармацыі прэс-службы Міністэрства па падатках і зборах, наогул па стану на 1 сакавіка гэтага года ў падатковыя органы Беларусі прадстаўлена 232 405 падатковых дэкларацый (разлікаў) аб сукупным гадавым даходзе за мінулы год. У тым ліку фізічнымі асобамі было прадстаўлена 211 602 дэкларацыі, а індывідуальнымі прадпрымальнікамі — 20 803. Лідзіруе па колькасці пададзеных дэкларацый Мінск — 61 803, а вось у абласцях найбольшая іх колькасць пададзена ў Мінскай — 31 890.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## МІНПРАМ ІНІЦЫІРУЕ ЎКЛЮЧЭННЕ ГРУЗАВІКОЎ З ТЭРМІНАМ ЭКСПЛУАТАЦЫІ БОЛЬШ ЗА АДЗІН ГОД У КАТЭГОРЫЮ ПАТРЫМАНЫХ

**Такім чынам будзе абмежаваны ўвоз патрыманых імпартных аўтамабіляў на тэрыторыю Беларусі і павысіцца канкурэнтаздольнасць айчыннай аўтамабільнай тэхнікі.**

Цяпер у Беларусі дзейнічае пошліна на ўвоз патрыманых грузавых аўтамабіляў старэйшых за тры гады. Яна складае 2,2 еўра за 1 куб.см рухавіка. У Расіі абмежаванні дзейнічаюць на ўвоз імпартных патрыманых аўтамабіляў старэйшых за пяць гадоў.

**БЕЛТА.**

## ЗАГІНУЛА ПАД КОЛАМІ СВАЙГО ТРАМВАЯ

Жудасная трагедыя адбылася ў Віцебску: на вуліцы Цітова жанчына—вадзіцель трамвая пры спробе расчапіць два трамвайныя вагоны загінула пад коламі. Як паведамілі ва УУС Віцебскага аблвыканкама, прычына здарэння — парушэнне правілаў эксплуатацыі электрычнага транспарту.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## «МЕРСЕДЭС-БЕНЦ» ПРАВАЛІЎСЯ ПАД ЛЁД

**У Івацэвіцкім раёне не пашанцавала 27-гадоваму непрацуючаму жыхару пасёлка Майск, які трапіў у ДТЗ каля гадзіны ночы ў нядзелю.**

Паводле даных аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Брэсцкага аблвыканкама, вадзіцель аўтамабіля «Мерседэс-Бенц» ехаў па дарозе Любішчыны — пасёлак Майск і ў нейкі момант не справіўся з кіраваннем: машына з'ехала ў канал з вадой, які часткова быў пакрыты лёдам. Аўтамабіль апынуўся пад вадой, а кіроўца, на жаль, не змог выратавацца.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## МАРОЖАНАЕ ЗДЗІВІЛА ВУЧОНЫХ

**Дзіўныя вынікі далі праведзеныя нядаўна навуковыя даследаванні. Як паведамляюць інфармацыйныя агенцтвы, ужыванне марожанага, смятаны і іншых малочных прадуктаў павышае ў жанчын здольнасць да дзетараджэння.**

Адсутнасць у меню жанчыны тлустых малочных прадуктаў скарачае на 85 працэнтаў яе шанцы нарадзіць дзіця ў параўнанні з сярэднестатыстычным узроўнем. А рэгулярнае іх ужыванне — павышае на 27 працэнтаў, адзначаюць вучоныя. Найбольш эфектыўнае ў гэтым сэнсе марожанае, якое не толькі карыснае, але і прыемнае на смак.

**Кар. БЕЛТА.**

## РАЗНЯ Ў МАХНОВІЧАХ...

**Сапраўды дзікае здарэнне адбылося ў вёсцы Махновічы Салігорскага раёна, дзе ад рук п'янага злачынцы загінулі трое вяскоўцаў, а яшчэ адна жанчына пацярпела.**

Паводле папярэдняй інфармацыі, падазраецца ў злачынстве непрацуючы жыхар вёскі Зялёны Бор, які напачатку першай гадзіны ночы, паспрачаўшыся з жыхаром Махновічаў, збіў апошняга да смерці. А потым пачаў разборкі з жанчынамі, якія з'яўляліся сведкамі таго, што адбылося. Схапіўшыся за нож, крымінальнік расправіўся з пенсіянеркай і 39-гадовай рабочай мясцовага сельгасвытворчага кааператыву. Яшчэ адной жанчыне, 35-гадовай непрацуючай, ён нанёс чатыры пранікальныя раненні брушной поласці: няшчасная была змешчана ў бальніцу. Падазроны ў гэтым злачынстве затрыманы, у яго канфіскаваны нож.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## «НАЧНОЕ ПАЛЯВАННЕ НА ЛІС»



Фота Уладзіміра ЧАБЕРКУСА, БЕЛТА.

**3—4 сакавіка на танкавым палігоне пад Брэстам прайшлі двухдзённыя спаборніцтвы па трофі «Начное паляванне на ліс», арганізаваныя брэсцкім клубам недарожнікаў «Цытадэль».**

12 экіпажаў з усёй Беларусі на спецыяльна падрыхтаваных машынах пераадолелі больш за 100 км па перакрыжаванай мясцовасці. Экіпаж кожнай машыны павінен быў па карце адшукаць макеты лісіц і сфатаграфаваць іх.

## АМФЕТАМІН З РАСІЙСКАЙ СЫРАВІНЫ

**Супрацоўнікі ўпраўлення па наркакантролю і процідзеянню гандлю людзьмі МУС краіны выявілі ў Мінску падпольную лабараторыю па вырабу амфетаміну.**

Паводле звестак МУС, некалькі жыхароў сталіцы арганізавалі вытворчасць псіхатропнага рэчыва ў гаражы. Сыравіну беларускія наркавытворцы набывалі ў Маскве. Менавіта дзякуючы супрацоўніцтву з расійскімі калегамі айчынным міліцыянерам удалося вывесці на чыстую ваду «гаражных наркадзялкоў». Падчас вобыску ў гаражы было знойдзена каля 1 кілаграма хімічных рэчываў, прызначаных для вырабу амфетаміну.

Дарэчы, у саматужных вытворцаў псіхатропных рэчываў быў яшчэ і запас боепрыпасаў: амаль 1 тысяча патронаў да пісталета Макарава.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

## У ГРОДНЕ ПРАЙШЛА ТРАДЫЦЫЙНАЯ ВЫСТАЎКА-КІРМАШ «КАЗЮКІ-2007»

4 сакавіка ў Гродне прайшла традыцыйная выстаўка-кірмаш «Казюкі-2007». Свята, на якое былі запрошаны больш як 100 майстроў з усіх абласцей рэспублікі, адбылося шосты раз. На выстаўцы прадстаўляліся вырабы з саломкі, скуры і лазы, керамічныя і каваныя вырабы, выцінанка, жывапісныя палотны, мяккая цацка і інш.




Фота Леаніда ШЧАГЛОВА, БЕЛТА.

Разам з птушкамі

# Пад знакам галасістага салаўя

**Вядучыя эколагі і прыродазнаўцы ўжо традыцыйна штогод выбіраюць у Беларусі птушку года. Нацыянальная кампанія пад знакам той ці іншай птушкі ажыццяўляецца ў нашай краіне ўжо восьмы раз. У розныя гады птушкамі года былі: белы бусел, белая пліска, авальга, дамавы верабей, гарадская ластаўка, барадатая кугакаўка і летась — кнігаўка. Сёлета рашэннем Рэспубліканскага савета ГА «Ахова птушак Бацькаўшчыны» птушкай года быў выбраны салавей. Аб гэтай цікавай і галасістай маленькай птушачцы карэспандэнту «Звязды» расказаў спецыяліст па кампаніях і экалагічнай адукацыі грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» Руслан ШАЙКІН.**



Арнітолагі выбралі салаўя птушкай года, бо яна даволі папулярная і вядомая сярод насельніцтва, мае паўсюдную распаўсюджанасць, нават у вялікіх гарадах яшчэ ёсць месцы, дзе жывуць салаўі. Але хапае ў гэтай птушкі і праблем, якія галоўным чынам звязаны з чалавекам...

У дзікай прыродзе салавей жыве ў вільготных лясах з густымі хмызнякамі. Вядома, што ён насяляе групы дрэў і кустоў на лугах і ў поймах рэк. Лічыцца, што ў населеных пунктах салавей селіцца ў старых парках і садах. Разам з тым у Мінску я шмат разоў чуў спевы салаўя ў прыватным сектары за мясакамбінатам па вуліцы Казінца, у кустоўі каля ракі Свіслач, на тэрыторыі ціхіх зялёных зон буйных медыцынскіх установаў або комплексаў, а таксама за агароджай закрытых дзіцячых садкоў або школ, якія добра ахоўваюцца. Салаўі не любяць месцы, дзе гуляюць людзі з сабакамі або бадзяюцца каты.

Справа ў тым, што гняздо салавей звычайна робіць на зямлі пад густым кустом, часам у сярэдзіне куста, якое заўсёды добра замаскіравана, рэдка — на сухіх галінках на вышыні да 1,5 метра над зямлёй.

Першымі ўвесну на разведку ў Беларусь прылятаюць самцы ў канцы красавіка—пачатку мая. Яны шукаюць лепшае месца з будучай «хаткай» і адразу пачынаюць співаць. Сваімі чароўнымі спевамі самцы прываблiваюць сяброўак і апавяшчаюць другіх салаўёў, што ўтульнае месца пад чаромхай ужо занятае. Вядома, што ў крылатым асяроддзі спяваюць выключна самцы. Песня складаецца з асобных завершаных куплетаў, якія завуцца каленамі. Гэтых кален можа быць больш за 10, і па іх колькасці прыхільнікі салаўёў вылучаюць лепшых спевакоў. Сапраўды ўражвае манера выканання гэтых шыкоўных вакалістаў. Ціхія гукі змяняюцца моцнымі, вясёлыя — сумнымі. Маладыя салаўі вучацца майстэрству ў сталых, пераймаючы іх спевы. Недзе каля 100 гадоў таму на тэрыторыі Расіі і ў краінах Заходняй Еўропы існавалі цэлыя традыцыі па вылоўліванню і ўтрыманню салаўёў у хатніх умовах. Сёння гэтыя традыцыі страчаны на тэрыторыі Беларусі назаўсёды.

У Беларусі шырока распаўсюджаны звычайны на гнездаванні пералётны і транзітны мігрыруючы від — усходні салавей. Гэта птушачка даволі маленькая, крыху большая за вераб'я. Харчуецца салавей і выкормлівае птушанят дробнымі насякомымі, вусенямі, слімакамі і іншымі бесхрыбетнымі жывёламі. Звычайна збірае корм на зямлі, дзе спрытна бегае пад кустамі.

У чашападобным гняздоўі бывае 4—5 яек, якія маюць афарбоўку ад цёмна-аліўкавага да зялёна-кававага колеру. Жывуць салаўі выключна парамі і прытрымліваюцца сваіх сем'яў на працягу мінімум некалькіх гадоў.

«Муж з жонкай» гэтай сям'і выглядаюць аднолькава і адрозніць іх можна толькі, калі самец спявае. Галасістыя маленькія спевакі не лічацца доўгажыхарамі, але бываюць выпадкі, калі ўзрост іх дасягае 7—8 гадоў. У летні сезон у Беларусі налічваецца каля 160 тысяч пар салаўёў.

Сёння ні ў адной краіне свету на салаўёў, як на дзіч, ужо не палююць, нават у Паўднёва-Ўсходняй Афрыцы, дзе гэтыя вакалісты зімуюць. Аднак...

Калісьці, у старажытныя часы, у Італіі і Іспаніі існавала самая вытанчаная страва для каралеўскіх асобаў, якая гатавалася з языкоў салаўёў.

Зараз большасць непрыемнасцяў салаўям дастаўляюць наземныя драпежнікі, а ў гарадах — суцэльнае, часам бяздумнае добраўпарадкаванне ўсіх прыродных куточкаў, выкошванне не вельмі прыгожых траў, высяканне хмызнякоў, татальнае прыбіранне апалага лісця. Гэтыя меры не паляпшаюць знешняе асяроддзе, а знішчаюць месцы пражывання дробных птушак, якія будуюць гнёзды на зямлі або ў кустах. Гэтая знешне непрыкметная птушачка, якая мае бурую афарбоўку з рыжаватым хвастом, спявае звычайна на змярканні і ўначы.

Паводле слоў Руслана Шайкіна, сёлета спецыяльныя службы Нацыянальнага банка краіны збіраюцца выпусціць у свет памятную манету, прысвечаную птушцы года — салаўю.

**Сяргей КУРКАЧ.**

**Настоящим уведомляем, что годовое собрание акционеров ОАО «Пивзавод Оливария» состоится 26 марта 2007 года в 14.00 в конференц-зале ОАО «Пивзавод Оливария» по адресу: город Минск, проспект Машерова, дом 19.**

Форма проведения собрания акционеров — очное.

Регистрация акционеров для участия в годовом собрании ОАО «Пивзавод Оливария» будет осуществляться **26 марта 2007 года с 12.50 до 13.50 в помещении конференц-зала ОАО «Пивзавод Оливария» по адресу: г. Минск, проспект Машерова, дом 19.**

Повестка дня годового собрания акционеров:

1) Утверждение итогов финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2006 год.

2) Отчет наблюдательного совета о работе в 2006 году.

3) Отчет ревизионной комиссии о работе в 2006 году. Утверждение заключения ревизионной комиссии по результатам проверки деятельности Общества за 2006 год.

4) Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков ОАО «Пивзавод Оливария» за 2006 год.

5) Утверждение результатов распределения прибыли и убытков Общества, выплаты дивидендов по итогам работы за 2006 год.

6) Основные направления использования чистой прибыли Общества в 2007 году.

7) Внесение изменений в Устав Общества.

8) Избрание членов наблюдательного совета.

9) Избрание членов ревизионной комиссии Общества.

10) Утверждение размера вознаграждений членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.

11) О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи.

Список лиц, имеющих право на участие в годовом собрании акционеров ОАО «Пивзавод Оливария» 26 марта 2007 года, составлен на основании реестра акционеров ОАО «Пивзавод Оливария» по состоянию на 05 марта 2007 года.

Материалы к годовому собранию акционеров ОАО «Пивзавод Оливария» от 26 марта 2007 года будут представлены для ознакомления акционерам с 20 марта 2007 года на информационном стенде в административном здании ОАО «Пивзавод Оливария» по адресу: г. Минск, проспект Машерова, дом 19.

При себе необходимо иметь паспорт или документ, подтверждающий полномочия на участие в собрании (доверенность).

Са святам 8 САКАВІКА віншуем любую матулю і жонку **Зою Бранiславаўну СЕРГІЕВІЧ**, сястрычку і дачку Кацярыну, дарагіх бабуль Соф'ю і Ядвігу. Зычым шчасця, усмешак і радасці ў кожнай хвіліне жыцця.

**Муж Уладзімір і дачка Таццяна,** *г. Маладзечна.*



Прашу слова

# МОВА — ПРАДМЕТ ДЗЯРЖАВАТВОРЧЫ

Навуковая грамадскасць нашай суверэннай дзяржавы зноў устурбавана: распрацоўшчыкі новага варыянта агульнаадукацыйнага Стандарта для ВНУ выключылі з яго раздзела «Сацыяльна-гуманітарныя дысцыпліны», абавязковага для выкладання ва ўсіх ВНУ, курс «Беларуская мова (прафесійная лексіка)». Кажу «зноў», бо ў самым канцы XX— пачатку XXI ст. гэтаксама нечакана-ціха са Стандарта зніклі такія прадметы гуманітарнага цыкла, як «Беларусазнаўства», «Гісторыя і тэорыя сусветнай культуры», «Беларуская мова». Пры гэтым нават не была прынятая пад увагу тая акалічнасць, што па гэтых прадметах, якія ў пачатку 1990-х гг. лагічна замянілі «Гісторыю КПСС», «Дыялектычны матэрыялізм», «Гістарычны матэрыялізм», «Навуковы камунізм» і іншыя чыста ідэалагічныя прадметы, былі створаны (і зацверджаны Міністэрствам асветы) спецыяльныя праграмы, вучэбныя дапаможнікі, дзейнічалі ў ВНУ асобныя кафедры і г.д. Праўда, «Гісторыя і тэорыя сусветнай культуры», куды арганічна ўключалася і гісторыя культуры Беларусі, тады была заменена агульнафіласофскай дысцыплінай «Культуралогія» (якая, дарэчы, у цяперашнім Стандарце пераведзена ў курсы па выбару). «Беларусазнаўства» ж знікла ўвогуле. Што да прадмета «Беларуская мова», то яго замянілі невялікім па колькасці гадзін курсам «Беларуская мова (прафесійная лексіка)». Цяпер, як бачым, знік і гэты прадмет, яму не знайшлося месца нават у пераліку курсаў па выбару.

Хацелася б звярнуць увагу на тое, што ўсе вышэйпералічаныя прадметы, паступова выключаныя са Стандарта, выконвалі, апрача ўсяго іншага, нацыятворчую, а таму — і дзяржаватворчую функцыю. Яны фармавалі ў маладога пакалення любоў да Бацькаўшчыны, яе гістарычнага мінулага і сучаснага, прывівалі пашану да стваральнай працы і баявых подзвігаў продкаў, урэшце — выхоўвалі патрыятызм, нацыянальную гордасць за сваю культурную спадчыну. Гэтую ж функцыю да апошняга часу выконваў, побач з «Гісторыяй Беларусі» і «Ідэалогіяй Беларускай дзяржавы», і абавязковы курс «Беларуская мова (прафесійная лексіка)». Бо мова — гэта не толькі сродак зносінаў. Гэта і своеасаблівая душа народа, адзін з важнейшых яго дзяржаўных сімвалаў. У ёй папсвойму акумуляваны гісторыя, культура, прырода, менталітэт нацыі, яе сувязі з іншымі этнасамі і г.д. Сёння, калі вуснамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнкі выразна заяўлена, што незалежнасць нашай краіны — гэта «самая вялікая заваёва за апошнія гады», у агульнаадукацыйным Стандарце асабліва ўзрастае роля дзяржаватворчых прадметаў, сярод якіх адно з першых месцаў займае курс беларускай мовы — мовы тытульнай нацыі, дзяржаўнай мовы РБ. Проста дзіўна, што распрацоўшчыкі Стандарта гэтага не ўлічваюць.

Увогуле, у той час, як, напрыклад, у брацкай нам Расіі звяртаецца вялікая ўвага на дзяржаўную рускую мову (скажам, 2007 год аб'яўлены годам рускай мовы), у апошнія гады Міністэрствам адукацыі РБ прыняты асобныя пастановы, скіраваныя, мякка кажучы, не на карысць дзяржаўнай беларускай мовы: у агульнаадукацыйных школах значна зменшана колькасць гадзін на яе вывучэнне, адменена выпускное сачыненне па беларускай літаратуры, што пісалася, натуральна, на беларускай мове, гісторыю і геаграфію Беларусі дазволена выкладаць на рускай мове... У ВНУ, як ужо сказана, прадмет «Беларуская мова» звузіўся толькі да авалодання прафесійнай лексікай. Усё гэта ў нашай цяперашняй сацыякультурнай сітуацыі, ва ўмовах фактычнай адсутнасці беларускай мовы ў дзяржаўным справаводстве, у большасці СМІ, сярэдніх школ, ВНУ і г. д., адчувальна зніжае валоданне грамадзянамі Беларусі дзяржаўнай (паводле Канстытуцыі РБ) беларускай літаратурнай мовай, якая на практыцы часта падмяняецца своеасаблівым моўным беларуска-рускім суржыкам, т. зв. трасянкай. Ці не ў гэтым адна з прычын заяў некаторых шавіністычна настроеных высокапастаўленых расійскіх чыноўнікаў, што ў рускіх і беларусаў «все едино», у тым ліку — і мова, што Беларусь — «окраина» Расіі, а таму, маўляў, чаму б ёй не ўвайсці ў яе склад на правах асобнай федэральнай акругі ці «по областям»?

Аднак — у дадзеным выпадку — важна нават не гэта. Дзіўна, што распрацоўшчыкі новага Стандарта і іх асобныя міністэрскія абаронцы ў рэспубліканскім друку прафесійную лексіку беларускай мовы ўспрымаюць не як агульнапрафесійную або спецыяльную дысцыпліну, а толькі як... «другасную і дапаможную» (гл., напрыклад, «Звязду» за 24.01.2007 г.). Але ж вывучэнне прафесійнай лексікі (дарэчы, праз паглыбленне ў этымалогію найменняў і іх супастаўленне з аналагічнай рускай лексікай) якраз і садзейнічае паглыбленню і пашырэнню, замацаванню ў памяці навучэнцаў спецыяльных паняццяў, разуменняў, выяўленых у пэўных лексемах, г.зн. прафесійнаму навучанню! З другога боку, як будучыя юрысты, гісторыкі, дыпламаты, інжынеры, урачы і г.д., не валодаючы прафесійнай беларускай лексікай, змогуць выконваць асобныя артыкулы таго ж «Закона аб мовах у Рэспубліцы Беларусь», паводле якога кіраўнікі, іншыя работнікі дзяржаўных органаў, органаў мясцовага кіравання і самакіравання, прадпрыемстваў, устаноў, арганізацый і грамадскіх аб'яднанняў павінны валодаць дзяржаўнымі беларускай і рускай мовамі ў аб'ёме, неабходным для выканання сваіх службовых абавязкаў? Як можа спецыяліст выконваць гэтыя патрабаванні суверэннай нацыянальнай дзяржавы, калі ён не валодае нават спецыяльнай тэрміналогіяй сваёй прафесіі?

Неабходна падкрэсліць, што ў апошні час, у сувязі з актыўнымі намаганнямі Прэзідэнта і Урада, накіраванымі на пабудову дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, прыкметна павялічылася цікавасць да беларускай мовы з боку розных замежных краін, якія рыхтуюць сваіх дыпламатычных і іншых прадстаўнікоў з арыентацыяй на веданне нацыянальнай мовы краіны будучай дзейнасці. Беларуская мова стала вывучацца ў буйнейшых універсітэтах свету, асобныя замежныя лінгвісты праходзяць стажыроўку ў вядучых універсітэтах Беларусі. Беларускамоўныя тэксты сталі своеасаблівым брэндам за мяжой, выкарыстоўваюцца ў рэкламных мэтах буйнейшымі сусветнымі фірмамі і г.д. У гэтых умовах проста незразумелым было б не стварыць магчымасці для саміх беларусаў розных прафесій удасканаліць імі веданне роднай мовы — адной з найстаражытнейшых і найбагацейшых славянскіх моў. Мовы Янкі Купалы і Якуба Коласа, развіццю і ўдасканаленню якой песняры аддалі ўсё сваё жыццё. Тым больш, у год для народных песняроў юбілейны, які, паводле Указа Прэзідэнта, будзе шырока адзначацца як у нашай дзяржаве, так і за яе межамі.

Што да магчымасцяў авалодання спецыяльнай тэрміналогіяй у ВНУ (і ўвогуле беларускай мовай), то для гэтага сёння маецца ўсё неабходнае: распрацаваны і зацверджаны Міністэрствам адукацыі спецыяльныя праграмы, вучэбныя дапаможнікі, выйшлі многія галіновыя даведнікі, энцыклапедыі. Апошнім часам апублікавана звыш 30 тэрміналагічных слоўнікаў, завершана выданне ўніверсальнай 18-томнай «Беларускай энцыклапедыі», дзе знайшла адлюстраванне прафесійная лексіка літаральна па ўсіх гуманітарных і прыродазнаўчых навуках, і інш. Ва ўсіх ВНУ, у тым ліку і тэхнічных, ёсць неабходныя высокакваліфікаваныя кадры філолагаў (над якімі, дарэчы, навісла пагроза скарачэння). Было б па меншай меры незразумелым не выкарыстаць увесь гэты патэнцыял для павышэння прафесійнай падрыхтоўкі кадраў, для выхавання нацыянальна свядомых грамадзян, актыўных будаўнікоў і абаронцаў суверэннай дзяржавы — Рэспублікі Беларусь.

Хачу ў заключэнне сказаць, што на старонках мной паважанай «Звязды» я папрасіў слова не толькі ад сябе асабіста, але і — як старшыня секцыі «Беларуская філалогія» рэспубліканскага Вучэбна-метадычнага аб'яднання па гуманітарнай адукацыі, дзе названы Стандарт абмяркоўваўся, — ад імя філолагаў вядучых універсітэтаў Беларусі. Ведаю, распрацоўшчыкі Стандарта, якія спачатку непрадумана знялі прадмет «Беларуская мова (прафесійная лексіка)», цяпер скажуць: а за кошт якіх гадзін увесці (дакладней — пакінуць) гэты прадмет? Што ж, у тэхнічных ВНУ, відаць, трэба будзе крыху «пацясніцца» філасофіі, сацыялогіі, паліталогіі, эканамічнай тэорыі. Што да гуманітарных ВНУ, то, пераканаты, вывучэнне прафесійнай лексікі беларускай мовы будучымі гісторыкамі, юрыстамі, дыпламатамі і інш., пойдзе на карысць больш, чым уведзены цяпер абавязковы 34-гадзінны курс «Асновы вышэйшай матэматыкі»...

**Вячаслаў РАГОЙША,**
**доктар філалагічных навук,**
**прафесар БДУ.**

Пытальнік

## Буракі і хрэн — супраць насмарку

***Кожную зіму і вясну я часта хварэю. А ад насмарку і ўвогуле няма выратавання. Лячуся ўсімі разрэкламаванымі па тэлебачанню сродкамі, але яны прыносяць аблягчэнне зусім ненадоўга. Напэўна, у мяне развілася да іх прывыканне. Падкажыце, калі ласка, нейкія народныя сродкі, якія могуць спыніць насмарк.***

**А.Л. Марахоўская,**
*г. Заслаўе.*

У першыя гадзіны пасля з'яўлення сімптомаў насмарку трэба прыкласці гарчычнікі да пятак, прыбінтаваць іх і нацягнуць зверху цёплыя шарсцяныя шкарпэткі. Трымаць гарчычнікі адну-дзве гадзіны, затым зняць іх і хуценька пахадзіць па дывановаму пакрыццю.

Нядрэнна вылечвае насмарк сок, атрыманы з сырых буракоў. Больш карысным лічыцца сок, які забрадзіў. У нос капаюць па 2—3 кроплі некалькі разоў на дзень.

Добры сродак ад насмарку таксама 30-працэнтны раствор мёду ў соку буракоў. Закапваюць па 5—6 кропляў 4—5 разоў на дзень.

Ці вось яшчэ некалькі рэцэптаў. Пчаліны мёд развесці цёплай (не больш за 45 градусаў) гатаванай вадой у прапорцыі адзін да двух і закапваць па 5—8 кропляў у кожную ноздру 3—4 разы на дзень.

Закапваць па 5 кропляў свежаадціснутага соку алоэ ў кожную ноздру праз кожныя 2—3 гадзіны пры вострым насмарку.

Зварыць два яйкі ў шкарлупіні, прыкласці іх з двух бакоў ад носа і трымаць, пакуль не астынуць. Два разы на дзень пры хранічным рыніце можна змазваць слізістую абалонку носа ватным тампонам на палачцы, прапітаным маслам абляпіхі.

Можна таксама змяшаць у роўных прапорцыях свежаадціснуты маркоўны сок і алей, дадаць у яго некалькі кропляў соку часнаку і закапваць у нос па 4—6 кропляў 3—5 разоў на дзень.

Пры гаймарыце добрым лекавым сродкам з'яўляецца хрэн. Карані хрэну трэба надзерці на тарцы. 1/3 шклянкі атрыманай масы змяшаць з сокам трох лімонаў і спажываць па палове чайнай лыжкі 1 раз на дзень праз 20—30 хвілін пасля сняданку. Курс лячэння пры хранічным гаймарыце складае 3—4 месяцы. Пасля двухтыднёвага перапынку яго можна паўтарыць. Такое лячэнне прыдатачных пазух носа здаўна выкарыстоўваецца ў народнай медыцыне. Восенню і вясной рэкамендуецца прымаць дзёрты хрэн з сокам лімона для прафілактыкі рэцыдываў хваробы.

# ПОБАЧ З ЛЕГЕНДАЙ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

*Пенсіянер з г.п. Ружаны* ***Валянцін СОБАЛЕЎ*** *жыве побач з колішнім Ружанскім палацам. Пасля завеі ён чысціць дарогу ад снегу.*

«ЦЯЖКАЕ» МЯСА

**Вечарам каля вёскі Малінаўка Драгічынскага раёна быў затрыманы аўтамабіль ЗІЛ-130, загружаны мясам.**

А падзеі развіваліся наступным чынам. Беларуска-ўкраінскую мяжу перасекла грузавая аўтамашына без рэгістрацыйнага нумара і пачала рухацца ўглыб нашай краіны. Мытнікі паспрабавалі яе затрымаць, але нягледзячы на аўтаматныя стрэлы ўгару, вадзіцель не спыніўся, а звярнуў у лес. Уцекача ўдалося дагнаць праз тры кіламетры. ЗІЛ-130 з пяццю тонамі ялавічыны заграз на лясной дарозе. Вадзіцель збег.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

Доктар на сувязі

## ЁСЦЬ ПЫТАННІ? ТЭЛЕФАНУЙЦЕ...

**Асноўную нагрузку на «гарачай» тэлефоннай лініі Міністэрства аховы здароўя (222-70-80) возьмуць на сябе:**

**6 сакавіка** — галоўны ўрач 7-й дзіцячай паліклінікі г. Мінска Святлана Дзмітрыеўна ПАРХЕЙЧУК. **7 сакавіка** — галоўны ўрач 2-й цэнтральнай раённай паліклінікі г. Мінска Уладзімір Іванавіч КУРЫШКА. **9 сакавіка** — галоўны ўрач 17-й сталічнай паліклінікі Сяргей Барысавіч САРОКІН.

Будні «Аховы»

## СХАДЗІЎ ПА ДАБАЎКУ

**Калі б яшчэ раніцай 59-гадовай непрацуючай «гламурна аформленай» мінчанцы хто-небудзь сказаў, што ў пяць вечара яна будзе корпацца ў смеццеправодзе з міліцыянерамі — яна, напэўна палічыла б гэта па меншай меры бязглуздым жартам...**

Дыхтоўнае футра і боты, нятанная футравая шапка, ахутаныя воблакам французскага водару не маглі не прыцягнуць увагу 27-гадовага раней судзімага непрацуючага мінчаніна, калі жанчына не спяшаючыся ішла па тратуару праспекта Ракасоўскага. Але больш за ўсё злачынцу зацікавіў дамскі рыдыкюль. Ён вырваў з рук сумку са словамі: «Пікнеш — прырэжу!». Жанчына паспешна дастала з кішэні футра мабільнік і набрала «02».

Праз некалькі хвілін няшчасная апісвала прыкметы злачынцы супрацоўнікам Ленінскага аддзела аховы сталіцы: прапаршчыку Юрыю Лесіну, старшаму прапаршчыку Анатолю Жыдовічу, старшаму лейтэнанту Вячаславу Шумскаму і сяржанту Віталю Котку.

На шчасце для міліцыянераў пад'езд, у якім схаваўся падазроны, не быў скразным. Прабегшы некалькі лесвічных пралётаў, ён хутка вывучыў змесціва трафея і, засунуўшы банкноты ў кішэню, выкінуў жаночую сумку ў смеццеправод. Пасля гэтага прабег яшчэ ўверх па прыступках і схаваўся ў адной з кватэр. Аднак усе гэтыя недвухсэнсоўныя маніпуляцыі былі заўважаны і па заслугах ацэнены жыльцом, які якраз выйшаў з кватэры з вядром смецця. Мала таго, гэта быў не проста жылец, а супрацоўнік міліцыі, у якога быў выхадны дзень. Кватэра, у якой спадзяваўся затаіцца затрыманы, належала яго прыяцелю, і там яшчэ гадзінай раней таварышы распівалі спіртное. І адправіўшыся ў бліжэйшы ўніверсам па дабаўку, госць сапраўды шчодра дабавіў: асабіста для сябе як мінімум яшчэ некалькі гадоў турэмнай славы.

**Марына ЭВЕРСМАН.**

## Сёння

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.47 | 17.55 | 11.08 |
| Віцебск — | 6.38 | 17.44 | 11.06 |
| Магілёў — | 6.37 | 17.46 | 11.09 |
| Гомель — | 6.32 | 17.44 | 11.12 |
| Гродна — | 7.02 | 18.11 | 11.09 |
| Брэст — | 7.01 | 18.13 | 11.12 |

**Месяц**

***Поўня 4 сакавіка.***
***Месяц у сузор'і Шаляў.***

**Імяніны**

**Пр.** *Аляксандра, Астапа, Данілы, Георгія, Цімафея.*
**К.** *Клаўдзіі, Ружы, Эльвіры, Віктара.*

## Надвор'е на заўтра




## ...у суседзяў

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА | +11 — +13 °С | Без ападкаў |
| ВІЛЬНЮС | +4 — +6 °С | Без ападкаў |
| КІЕЎ | +5 — +7 °С | Без ападкаў |
| МАСКВА | +1 — +3 °С | Без ападкаў |
| РЫГА | +2 — +4 °С | Без ападкаў |
| С-ПЕЦЯРБУРГ | +1 — +3 °С | |

## 6 сакавіка

Дзве даты




**1249 год** — вялікі князь Міндоўг разграміў каля горада Крутагор'е войска татарскага хана Койдана, і з таго часу Крутагор'е стала называцца Койданава (з 1932 года — горад Дзяржынск).

**1990 год** — З'езд народных дэпутатаў СССР прызнаў існаванне ў Савецкім Саюзе ўсіх формаў уласнасці.

Цытата дня:

***«Калі свае недахопы ты бачыш у тумане, навошта ж ты бачыш іх пільна ў іншых, як арол ці змей эпідаўрскі?».***

**Гарацый (65—8 да н.э.), рымскі паэт.**

Усміхнёмся!

**Увечары сіноптыкі абяцаюць пацямненне.**

☺

*— Паслухай, Таццяна ходзіць да цябе ў госці?*
*— Так.*
*— І што вы робіце?*
*— Глядзім тэлевізар.*
*— Але ж у цябе няма тэлевізара!*
*— Яна гэтага пакуль не заўважыла...*

☺

**Пісаць на аўтамабілі «я — няўмелы вадзіцель, які спрабуе хутка ездзіць на машыне, якая добра не ўмее нават тармазіць» — доўга і нязручна. Пішуць прасцей: «Street Racer».**

☺

*— А мы ўжо святочны торт разрэзалі!*
*— Як разрэзалі?! З яго ж цешча павінна была выскачыць!!!*

☺

**Апошні дыск групы «Звери» зусім не падобны на ўсе іх папярэднія альбомы. Зараз там вокладка зялёненькая.**

КІРМАШ
штотыднёвы рэкламны выпуск
№ 9 (541)

аддзел рэкламы
☎ 287-17-79
Рэквізіты для аплаты: р/р 3012210270016 у ААТ "Белінвестбанк" г.Мінска, код 739 УНН 100155376

# ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### Прадаецца

■ Дом драўляны добраўпарадкаваны ў в. Каменка Шчучынскага раёна, маецца тэлефон, сад, побач возера; недабудаваны драўляны дом, зручны для перавозу.
*Тэл. (8-01514) 3-45-47.*

■ Кватэра ў 2-павярховым доме, які будуецца (11 км ад г. Брэста), пастаянная справа, маецца газ, побач лес, вадаём.
*Тэл. 8-029-601-69-81.*

■ Драўляны дом, зручны для перавозу, у Нясвіжскім раёне.
*Тэл. 8-029-135-79-31.*

■ Кінакамеры «Кварц-2-8С3», «Кіеў 16 УЭ», «Краснагорск», «Украіна-5». Фотаапараты «Фотакор», «Масква-4, 5», «Кіеў—Вега», «Кіеў-6С» і шмат розных аб'ектываў.
*Тэл. (8-01513) 33-110.*

■ Мабільны тэлефон «Нокіа 6030», б/к, гарантыя.
*Тэл. (8-017) 276-18-74.*

■ Пчаласем'і і пчолапакеты «Карпатка».
*Тэл.: (8-01718) 32-427, 8-029-138-24-27.*

■ Гараж у г. Мінску па вул. Трасцянецкай, падвал па перыметру, ахова, 7900 у.а.
*Тэл. (8-017) 295-96-84.*

■ Газавая пліта «Гефест», новая.
*Тэл. 8-029-654-11-62.*

■ Карданны вал, задні мост да ЗІЛ-130 і ГАЗ-52, дыск счаплення да ЗІЛ-130.
*Тэл. (8-01719) 38-492, увечары.*

■ Кацёл электрычны КПЭ-60 для прыгатавання ежы, вуллі на 16 рамак, цана па дамоўленасці.
*Тэл. (8-01710) 27-972.*

Плуг 3-корпусны, на цыліндрах, б/к, да МТЗ, 700 у.а., пагрузчык новы да Т-16 — 1500 у.а.
*Тэл. (8-01561) 90-180.*

■ «Масквіч-2141», 1992 г.в., газ-бензін, магнітола, 600 у.а.
*Тэл. 8-029-702-15-43.*

■ «Мерседэс-201», 1985 г.в., у добрым стане, танна.
*Тэл.: (8-01792) 55-725, 8-029-931-82-28.*

■ Нівелір Н3 (новы), сейф для захоўвання ружжа, б/к.
*Тэл. (8-01719) 38-492.*

**У суд Ваўкавыскага раёна Гродзенскай вобласці** паступіла заява аб прызнанні адсутным без вестак **КРАТА Мікалая Пятровіча,** 9 снежня 1947 года нараджэння, ураджэнца в. Мелехавічы Зэльвенскага раёна Гродзенскай вобласці, які ў сакавіку 1996 года выехаў на заробкі ў Расію і да цяперашняга часу месцазнаходжанне яго невядомае. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць аб ім звесткі, паведаміць іх суду на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

ЗВЯЗДА

**КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ**

**Запоўніце разборліва, выражце і вышліце на адрас рэдакцыі**

**220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А.**

**АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ваша прозвішча, адрас, хатні тэлефон.**

**Тэлефон для даведак 287-17-79.**

Пашпарт серыя__________ № __________ Выданы__________

Подпіс__________ Дата__________

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, А. МЯСНІКОЎ, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19; аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.

html: www.zvyazda.minsk.by E-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 37.095. Індэкс 63850. Зак. № 1284. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12